# БІБЛІЯТЭЦЫ УНІВЕРСІТЭТА — 40 ГОД

## ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!



## ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

У 1930 годзе бібліятэка займала плошчу ў 106,74 квадратнага метра, а зараз — 637.

• • •

У бібліятэцы працуе 22 супрацоўнікі, з якіх 17 маюць вышэйшую адукацыю, 5 — сярэднюю і 2 закончылі па дзве ВНУ.

• • •

За год бібліятэка папаўняецца ў сярэднім на 25—35 тысяч экземпляраў кніг.

• • •

На 1970 год адпушчана на закупку літаратуры 16,2 тысячы рублёў, а закуплена — на 30,1.

• • •

У сувязі з адкрыццём універсітэта нашай бібліятэцы была аказана вялікая дапамога ў камплектаванні літаратурай новых факультэтаў бібліятэкамі МДУ, ЛДУ, БДУ, АН БССР і іншымі.

• • •

Фонд бібліятэкі складае на 1 лістапада 1970 года 335395 кніг.

• • •

За год наведванне бібліятэкі чытачамі складае 159369 разоў.

• • •

На аднаго супрацоўніка аддзела абслугоўвання прыходзіцца да 506 чытачоў, і на працягу года супрацоўнік гэтага аддзела выдае чытачам да 16 тысяч экземпляраў літаратуры.

• • •

Адзін чытач зараз наведвае бібліятэку да 31 разу, а кніг атрымоўвае ў сярэднім 48 экземпляраў.

• • •

На аднаго чытача нашай бібліятэкі прыходзіцца 63 экземпляры кніг.

• • •

З 1970 года бібліятэка выпісвае літаратуру з капіталістычных краін на залатую валюту.

• • •

Бібліятэка мае фонд рэдкай кнігі, у якім захоўваюцца выданні 17 і 18 стагоддзяў.

• • •

Даведачна - бібліяграфічны аддзел зараз наведваюць у дзень у сярэднім да 56 чытачоў, а даведак разнастайнага характару выдаецца да 50. У гэтым аддзеле сабран увесь даведачны фонд, які налічвае 11 тысяч экземпляраў.

• • •

Адзін супрацоўнік аддзела апрацоўкі літаратуры за год апрацоўвае да 8000 экземпляраў кніг.

• • •

Бібліятэка выпісала на 1971 год 35 назваў газет і 394 часопісы.

• • •

Фонд літаратуры на замежных мовах складае 1309 экземпляраў. Тут прадастаўлена літаратура на англійскай, нямецкай, французскай, польскай, чэшскай, балгарскай і іншых мовах.

## ВЯЛІКІ ЎКЛАД

Нашай бібліятэцы споўнілася 40 год. Гэта знамянальная і радасная падзея не толькі для яе невялікага калектыву, але і для ўсіх супрацоўнікаў і студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. У дзень свята мне хочацца адзначыць вялікі ўклад, які ўносяць супрацоўнікі бібліятэкі ў няспынны рост і ўдасканаленне кадраў, у павышэнне іх навуковай кваліфікацыі і пашырэнне грамадска-палітычнага кругагляду, педагагічнага і лектарскага майстэрства.

Здзяйсняючы гэтую работу на высокім ідэйным і прафесіянальным узроўні, праяўляючы пастаянную дабразычлівасць у адносінах да сваіх шматлікіх чытачоў, наша бібліятэка заваявала трывалы аўтарытэт. Гэта важнае складаемае ў паспяховай рабоце нашага універсітэта.

У бібліятэцы стала добрай традыцыяй своечасова інфарміраваць чытачоў аб паступаючай літаратуры. Гэтаму садзейнічаюць рэгулярныя выстаўкі-агляды новых кніг, штомесячныя друкаваныя бюлетэні. Многа цікавых і змястоўных мерапрыемстваў праводзіць наша бібліятэка па прапагандзе навуковых ведаў. Узяць хаця б апошняе з іх. У лістападзе з поспехам прайшла чытальніцкая канферэнцыя «Будучае навукі». Даклады і выступленні выкладчыкаў і студэнтаў з захапленнем слухала аўдыторыя.

Клопаты аб далейшым развіцці бібліятэкі павінны стаць пастаяннай задачай не толькі саміх яе работнікаў, але і ўсіх кіруючых арганізацый ГДУ, студэнтаў і выкладчыкаў.

Адзначаючы 40-гадовы юбілей бібліятэкі, мы жадаем яе супрацоўнікам новых творчых дасягненняў і шырокіх кантактаў з вялікай чытальніцкай аўдыторыяй.

**В. ПАРМЕНАЎ,**
**прафесар.**

**На свеце многа прафесій цікавых і розных. І кожная з іх нясе чалавеку радасць і задавальненне. Прызваннем гэтых жанчын стала прапаганда кнігі — вялікай скарбніцы чалавечага розуму. І з дня ў дзень выконваюць яны свой непрыкметны і ганаровы абавязак.**

**Кожны дзень мы сустракаемся са сціплымі працаўнікамі універсітэцкай бібліятэкі. Неабходную кнігу, падручнік, апошні нумар часопіса, даведку — усё гэта яны нам выдаюць хутка і дакладна.**

**Сёння ў калектыва бібліятэкі свята — 40-годдзе. З гэтай падзеяй яго віншуе ўвесь калектыў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.**

**Наш фотакарэспандэнт Анатоль Рудчанка зазняў старэйшых супрацоўнікаў бібліятэкі старшага бібліятэкара Нэлю Абрамаўну Гурэвіч, старшага бібліёграфа Розу Рыгораўну Хазанаву, бібліятэкара Галіну Францаўну Старынскую, загадчыцу аддзела Марыю Данілаўну Гапееву і бібліятэкара Ларысу Фёдараўну Кавалерчык.**

## НАШ СЯБАР

Бібліятэка — наш сябар. Менавіта гэтыя словы хочацца сказаць, характарызуючы дзейнасць яе калектыву. Яна стала адным з важнейшых аддзяленняў усёй навуковай дзейнасці універсітэта. У бібліятэцы студэнты і навуковыя супрацоўнікі маюць магчымасць атрымаць многае з таго, што створана перадавымі вучонымі не толькі нашай краіны, але і замежных дзяржаў. Праз яе ў нас ёсць магчымасць мець кантакты з сапраўднай вялікай навукай, узбагачаць сваю памяць лепшымі дасягненнямі перадавой думкі сучаснасці.

Мне хочацца падзяліцца сваімі думкамі аб нашай бібліятэцы, расказаць аб яе сціплых працаўніках, аб тым, як яны дапамагаюць студэнтам у вучобе. У гэтым калектыве сабраўся дружны і творчы народ. Удумліва, з вялікім тактам абслугоўваюць чытачоў М. Д. Гапеева, Л. Ф. Кавалерчык, Л. К. Кустава, В. М. Бараноўская. Цяжка пераацаніць тое, што робяць у даведачным аддзеле Е. А. Дубінчык, Т. Ф. Каленікава, Н. А. Гурэвіч, Г. М. Цыганкова. Без іх сціплай працы чытачам было б цяжка разабрацца ў моры навін, якія паступаюць у кнігасховішча.

Аператыўна вырашае ўсе пытанні загадчык бібліятэкі М. Л. Драцэвіч. Зладжаны калектыў робіць усё магчымае, каб хутка інфарміраваць чытачоў аб усіх навінках навуковай думкі. Для гэтага выкарыстоўваюцца розныя формы бібліятэчнай работы — з густам аформленыя стэнды, выстаўкі апошніх паступленняў айчыннай і замежнай літаратуры, чытальніцкія канферэнцыі і дыспуты. Цяжка сказаць, колькі карыснага атрымлівае пасля гэтых мерапрыемстваў чытач.

У дзень урачыстасці хочацца сказаць і аб тым, як павінна развівацца універсітэцкая бібліятэка. Вядома, што каштоўнасць кожнай бібліятэкі ў яе кнігах, яе фондзе. Бібліятэка ГДУ пашырае яго. У студэнтаў узнікаюць цяжкасці з-за адсутнасці чытальнай залы. Яна нам вельмі неабходная. Многае ў дзейнасці чытачоў можа зрабіць сучасная аўтаматызацыя. У рабоце з кнігай без яе не абыйсціся.

Шмат літаратуры студэнты і навуковыя супрацоўнікі выпісваюць праз міжбібліятэчны абанемент. Трэба адзначыць, што тэрміны атрымання яшчэ нас не задавальняюць.

Гэта толькі некалькі заўваг. Вядома, што ў свята не заўсёды гавораць аб недахопах. Але ж Уладзімір Ільіч Ленін гаварыў, што лепшы спосаб адзначыць юбілей — завастрыць сваю ўвагу на недахопах.

Сорак год — узрост сталасці. Няма сумнення, што юбіляр яшчэ неаднаразова будзе нас радаваць сваёй работай, удасканальваць яе формы і метады.

**Л. ВЕЛІКОВІЧ,**
**студэнт 4 курса механіка-матэматычнага факультэта.**

## ДЗЯКУЙ!

У фондах нашай бібліятэкі ёсць шмат каштоўных прац па матэматыцы і гісторыі навук. Шырока прадстаўлены айчынныя і замежныя перыядычныя выданні.

Чоткая работа бібліяграфічнага аддзела хутка дазваляе атрымаць патрэбныя даведкі. Калі ж якой-небудзь літаратуры ў бібліятэчных фондах няма, яе мы атрымліваем з іншых гарадоў краіны. У гэтым нам заўсёды шчыра дапамагаюць работнікі бібліятэкі. Вялікае дзякуй ім за клопаты.

**Г. ФРЫДМАН,**
**кандыдат фізіка-матэматычных навук.**

• • •

Мы — будучыя філолагі. Цяжка пералічыць літаратуру, якая неабходна нам для плённай вучобы. Падручнікі, творы класікаў марксізма-ленінізма, навінкі мастацкай літаратуры. Без іх немагчыма наша студэнцкае жыццё.

Работнікі бібліятэкі вучаць нас рабоце з кнігай, дапамагаюць эканоміць час, хутчэй знаходзіць патрэбнае. Іх клопаты мы адчуваем на кожным кроку.

**Студэнты 2 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

## ЧУЛЫЯ ПРАЦАЎНІКІ

Работа універсітэцкай бібліятэкі з'яўляецца важным звяном у падрыхтоўцы выкладчыкамі вучэбнага працэсу і ў правядзенні імі навукова-даследчай работы. Своечасовае забеспячэнне неабходнай навуковай літаратурай у многім вызначае паспяховае выкананне праводзімых даследаванняў. У гэтым вялікую ролю адыгрывае міжбібліятэчны абанемент. Ён дапамагае атрымаць літаратуру, якая адсутнічае ў нашай бібліятэцы.

На працягу некалькіх год я карыстаюся МБА. Па гэтаму абанементу я атрымліваю айчынную і замежную літаратуру па біялогіі. Работнікі бібліятэкі В. М. Касцючэнкава, М. Д. Гапеева і іншыя дапамагаюць мне карыснымі парадамі, хутка і кваліфікавана абслугоўваюць. Гэтымі прынцыпамі ў рабоце кіруецца весь калектыў бібліятэкі. Заяўкі на літаратуру выконваюцца дакладна.

У дзень юбілея, як пастаянны чытач, я выказваю калектыву бібліятэкі шчырую падзяку за чуласць і вялікую дапамогу ў навукова-педагагічнай дзейнасці.

**Н. ШАЛУХІН,**
**дацэнт кафедры фізіялогіі раслін.**

## ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

Кожны член калектыва ўзяў на сябе абавязацельствы праводзіць у год адно масавае мерапрыемства і 5 бібліяграфічных аглядаў дадаткова да асноўнага плана.

• • •

Першы год, як у бібліятэцы прыступілі да навукова-даследчай работы ў галіне бібліятэказнаўства і бібліятэкаграфіі.

• • •

Калектыў бібліятэкі з 1969 года ўзяў шэфства над школьнымі бібліятэкамі Чачэрскага раёна. Адзін раз у год усе бібліятэкары выязджаюць у раён на тры дні для аказання метадычнай і практычнай дапамогі, для чытання лекцый перад працаўнікамі раёна.

• • •

Бібліятэка выпісвае адсутнічаючую літаратуру па міжбібліятэчнаму абмену з 53 бібліятэк Савецкага Саюза.

• • •

Зараз кожны супрацоўнік бібліятэкі вывучае самастойна польскую, чэшскую, балгарскую мовы (па выбару).

• • •

Тры супрацоўнікі займаюцца ў вячэрнім універсітэце марксізма-ленінізма, тры — набываюць спецыяльнасць на бібліятэчным факультэце.

